Кибератака Sunburst, выявленная в декабре, началась за несколько месяцев до того. Как заявляла замглавы Совета нацбезопасности США по кибербезопасности **Анна Нойбергер**, всего были скомпрометированы 9 федеральных агентств и около 100 частных компаний. Взлому подверглись, в частности, компьютерные сети американского казначейства, министерств торговли и национальной безопасности. Злоумышленники внедрили вредоносный код в обновления системы сетевого управления SolarWinds Orion. По данным *The Washington Post*, за атакой стоит российская группа хакеров Cozy Bear (она же APT29), связанная с СВР. Американские спецслужбы признали, что источник атаки – *«вероятно, российский по происхождению»*.

БЫВАЕТ И ТАКОЕ

Женщина во время свадьбы узнала в невесте сына давно потерянную дочь



Жительница китайского города Сучжоу (провинция Цзянсу) во время свадьбы сына узнала в его невесте давно потерянную дочь.

31 марта во время свадьбы своего сына женщина заметила на руке его невесты родимое пятно. Она была шокирована, так как точно такое же пятно было у ее дочери, которую она потеряла много лет назад.

Китаянка подошла к родителям невесты и спросила, не была ли она удочерена более 20 лет назад. Семью поразил этот вопрос, так как они долго держали этот факт в секрете. Оказалось, что когда-то они нашли девочку на обочине дороги. Они подобрали ее и вырастили как свою дочь.

Невеста рассказала, что встреча с матерью была для нее даже более счастливым событием, чем сама свадьба. Девушку обеспокоил тот факт, что она выходит замуж за своего старшего брата. Тогда их мать призналась, что усыновила его, когда потеряла надежду обрести пропавшую дочь после долгих лет поисков. Таким образом, для свадьбы нет никаких препятствий, так как жених и невеста не являются биологическими родственниками.

Этот факт успокоил невесту, и свадьба продолжилась.

ИЗ ПРЕССЫ

Предсказана беспрецедентная катастрофа в Антарктике

Ученые Университета Рединга предсказали, что более трети площади шельфовых ледников Антарктики может оказаться под угрозой обрушения в море, если глобальная температура достигнет отметки в 4 градуса Цельсия выше доиндустриального уровня. Об этом сообщается в статье, опубликованной в журнале *Geophysical Research Letters*.

Исследователи провели моделирование регионального климата с высоким разрешением, чтобы спрогнозировать влияние таяния и стока воды на стабильность шельфового льда. Согласно различным сценариям, в текущем столетии глобальные температуры могут повыситься на 1,5, 2 и 4 градуса Цельсия, что ускорит таяние льдов в Антарктиде до беспрецедентного уровня. Сами шельфовые ледники играют роль пробки, препятствующей сходу с берега в океан огромных масс льда.



Каждое лето лед на поверхности шельфового ледника тает и стекает в небольшие зазоры в слое снега ниже, где снова замерзает. Если талой воды становится слишком много, это может расколоть ледник и вызвать его обрушение в море, что и произошло с шельфовым ледником Ларсен B в 2002 году.

Ученые определили шельфовые ледники Ларсена C, Шеклтона, Пайн-Айленда и Уилкинса как наиболее подверженные риску обрушения при потеплении на четыре градуса Цельсия. В целом 34 процента площади всех шельфовых ледников Антарктики, что приравнивается к полумиллиону квадратных километров, будут подвержены риску катастрофической дестабилизации.

НА СВЯЗИ – ЛОНДОН

Великобритания откроет границы для туристов?

Так, власти намерены классифицировать страны по «системе светофора» – на «зеленые», «желтые» и «красные». От категории будет зависеть, должны ли путешественники изолироваться по возвращении в королевство или сдать ПЦР-тест. Например, прибывающие из «зеленых» стран будут освобождены от прохождения двухнедельного карантина.

Также Министерство транспорта Великобритании заявило о создании «списка наблюдения» с перечислением государств, которые со временем могут перейти из категории «зеленых» в «желтые». По словам чиновников, это поможет путешественникам заранее планировать поездки с учетом всех рисков.

Ожидается, что в мае британское правительство даст окончательный ответ по поводу зарубежных поездок и составит списки стран со статусами по заболеваемости.

Кроме того, отмечается, что списки будут регулярно пересматриваться с учетом таких факторов, как степень распространения COVID-19 и реализация программ вакцинации.

Ранее в марте стало известно о запрете туристических поездок для граждан Великобритании в связи с распространением инфекции. Согласно заявлению правительства, с 29 марта британцы могут покидать страну только с целью работы, учебы, юридических обязательств и по причине других важных жизненных обстоятельств.



СЛЫШАЛИ?

Гинцбург выступает за массовую вакцинацию животных от коронавируса

*Эпидемия коронавируса среди животных – новая угроза развития заболевания, с большой вероятностью потребуется их массовая вакцинация, считает глава центра им.Гамалеи **Александр Гинцбург**.*

В интервью «Интерфаксу» он отметил, что сейчас возникает новая опасность – животные, *«заболевание может стать природноочаговым»*.

«Есть угроза появления нового варианта вируса, и это будет уже настоящая третья стадия инфекционного процесса – когда очажок будет у вас в квартире. Эта опасность сегодня очень хорошо просматривается», – сказал академик.

На вопрос, потребуется ли массовая вакцинация животных, он ответил: *«Скорее всего, понадобится. Дай Бог, чтобы эта вакцина была хорошей и эффективной»*.

При этом Гинцбург заметил, что к вакцине для животных не нужно будет предъявлять жесткие требования в плане безопасности.

«Если там у норок или у кошечек температура поднимется на три дня, это не так страшно», – пояснил ученый.

Он отметил, что вакцина «Спутник V», возможно, подошла бы для животных. *«Я пока не проверял – давайте сначала всех людей защитим»*, – добавил Гинцбург.

ИЗ ЖИЗНИ МИЛЛИАРДЕРОВ

Остров Рыболовлева за миллион евро в неделю

*Российский миллиардер **Дмитрий Рыболовлев** строит VIP-курорт на острове, который ранее принадлежал магнату **Аристотелю Онассису**. Forbes опубликовал фотографии проекта, предоставленные представителем бизнесмена.*

В конце декабря 2019 года власти Греции одобрили строительство элитного туристического комплекса VIP Exclusive Club на острове Скорпиос, принадлежащем Дмитрию Рыболовлеву. Бывший владелец острова миллиардер Аристотель Онассис купил его в 1963 году, а Рыболовлев приобрел Скорпиос у наследницы греческого бизнесмена Афины в 2013 году за 120 миллионов долларов.

С 1988 года, после смерти дочери Онассиса Кристины, остров был заброшен, поэтому потребовалась капитальная реставрация инфраструктуры, рассказывал представитель бизнесмена. Согласно проекту, на острове будут возведены отель, спа-центр, 12 вилл, спортивный комплекс, ферма, виноградник, амфитеатр и вертолетная площадка. Чтобы остров мог принимать большие яхты, гавань расширят. Завершение проекта запланировано на 2024 год.

В 2014 году дочь Рыболовлева Екатерина отметила на этом острове свое 25-летие, а в 2015 году – свадьбу. Семья миллиардера планирует и дальше периодически использовать Скорпиос для себя, а в остальное время сдавать его в аренду, но не отдельные виллы, а весь остров целиком. Стоимость аренды пока не определена, но, по словам представителя Рыболовлева, она точно превысит 1 миллион евро в неделю.



100 РАДКОЎ

Міхася СКОБЛЫ

Вы хочаце стаць акупантам, генерал-маёр юстыцыі Дзмітрый Гара?

Прачытаў навіну пра паход праваабаронцы **Алеся Бяляцкага** ў Следчы камітэт. Выклікалі яго туды на допыт, як выклікаюць штодзень дзясяткі і сотні чалавек па ўсёй краіне. Не пазайздросціш следчым – працы ў іх апошнім часам хоць адбаўляй. Яны, праўда, спраўляюцца і разам з пракуратурай і судамі напакоўваюць турмы пад завязку – усе асуджаныя скардзяцца на перапоўненыя камеры.

Следча-судовая машына спраўна круцілася і раптам – дала збой. І прыпыніў адзін з яе канвеераў той самы Алесь Бяляцкі. У Следчым камітэце ён запатрабаваў, каб допыт і пратакол вяліся на беларускай мове. І канвеер, скрыгатнуўшы, спыніўся. Аказалася, што той, хто павінен быў весці допыт, не валодае беларускай мовай. Не суахілі, не якой-небудзь гвінейска-бісаўскай, а дзяржаўнай, тытульнай для Рэспублікі Беларусь!

Магчыма, у вачах следчай **М.В.Кананавай** (так значылася на позве) грамадзянін Алесь Бяляцкі вырашыў проста павыдурняцца. Як жа так: чалавек скончыў філфак універсітэта і не разумее рускай мовы? А вось не разумее, забыў, пахаваў у памяці і каменем прываліў. Уся справа якраз у тым, што дзейнае заканадаўства дазваляе грамадзяніну Бяляцкаму не ведаць рускую мову. Але тое самае заканадаўства не абавязвае дзяржслужачую Конанаву ведаць абедзве дзяржаўныя мовы. Што, вядома ж, не стварае юрыдычнай пасткі, можна ўрэшце дапытаць і з дапамогай перакладчыка. Але стварае прэцэдэнт – ганебны для Следчага камітэта.

Бо і праўда, пасмешышча дый годзе: беларускія следчыя не валодаюць беларускай мовай! Дзе, у якой краіне такое магчыма? Хіба можна дапусціць, што ў нейкай прэфектуры Парыжа службовец у пагонах не ведаў бы французскай? Ды яго да той прэфектуры на гарматны стрэл не падпусцілі б! Адправілі б давучвацца ў пачатковую школу. Бо няведанне дзяржаўнай мовы дзяржслужбоўцам – гэта проста прафнепрыгоднасць, якая крычма крычыць. Крычыць крычма!

Ці чуе гэты крык нядаўна прызначаны на пасаду кіраўніка Следчага камітэта генерал-маёр юстыцыі **Дзмітрый Гара**? Падазраю, што і ён (народжаны ў Тбілісі, вучыўся ў Маскве) не валодае дзяржаўнай беларускай мовай. Калі гэта так, то хай спыняе ўсе допыты, шыхтуе свой камітэт і вядзе калонай у Таварыства беларускай мовы на паклон да Алены Анісім. Каб арганізавала для яго работнікаў паскораныя моўныя курсы. Бо – прафнепрыгодныя ж! Нягледзячы на маёрскія, палкоўніцкія і генеральскія пагоны на плячах.

Чым большыя пагоны, тым большая ўлада, тым большыя фанабэрыя і лянота. Маўляў, я і без беларускай мовы да лампасаў на штанах даслужыўся, навошта яна мне цяпер? Ці не лепш замест моўнага "всеобуча" для падначаленых правесці папраўкі ў закон праз Палату прадстаўнікоў? Заручыўшыся, вядома ж, падтрымкай начальніка, на чыіх пагонах гербы велічынёй з патэльню.

Што ж, танк віламі не спыніш. Дапускаю нават, што пры сённяшняй уладзе заканатворчы канвеер можа закруціцца і ў такім накірунку. Пара подпісаў, пара пячатак – і грамадзянін Алесь Бяляцкі, а з ім яшчэ шэсць мільёнаў грамадзян, пазбавяцца права зносіцца з праваахоўнай сістэмай на роднай ім мове.

У цяперашняй Беларусі магчыма ўсё. Але хай ведаюць усе, хто прыкладзе руку да таго магчымага пры дзейным рэжыме дыскрымінацыйнага закона, што, прыняўшы яго, яны стануць на беларускай зямлі акупантамі. Бо мову тытульнай нацыі дыскрымінуюць, забараняюць і знішчаюць толькі акупанты.

Вы хочаце стаць акупантам, генерал-маёр юстыцыі **Дзмітрый Гара**? Калі так, то тады дзейнічайце. І беларусы таксама пачнуць дзейнічаць. У адказ на вашы акупанцкія дзеянні.

Дзяржаўная мова – гэта адзін з абарончых шчытоў любой дзяржавы. Аднымі ракетамі ці танкамі яе ў сучасным свеце не абароніш – пра гэта красамоўна сведчаць падзеі ў суседняй Украіне. І таму замах на беларускую мову (у любым выглядзе – ад службовага ігнаравання да разнастайных рэпрэсій) – гэта замах на дзяржаўнасць Беларусі.

Адпаведна ўсе тыя, хто размаўляе па-беларуску, пашырае беларускую мову, адстойвае яе канстытуцыйныя (пакуль што) правы, – беларускую дзяржаўнасць умацоўваюць. І грамадзянін Алесь Бяляцкі сваім учынкам проста перасцярог Следчы камітэт: не гуляйце з агнём, не ператварайцеся ў акупантаў. Хочацца верыць, што з той перасцярогі там будуць зроблены разумныя высновы.

А пакуль мы ўсе павінны зразумець, што наша зброя ў змаганні з ворагам – знешнім ці ўнутраным (і такі мае месца ў Беларусі) – мова. Мы мусім узброіцца мовай і прыходзіць з ёй і ў следчыя камітэты, і ў міліцэйскія пастарункі, і ў суды. Хай прыпыняюцца іхнія канвееры, хай варушацца ў іх работнікаў мазгавыя звіліны, хай, імкнучыся абяззброіць нас, яны выставяць напаказ сваю антыбеларускую сутнасць. Паставяць сабе на лоб кідкае кляймо.

Перад пагрозлівай рэпрэсіўнай машынай, што ніяк не хоча суцішыць хаду, мы маем права і павінны выйсці не з голымі рукамі. Мы павінны ўзброіцца.

Узброіцца да зубоў.

Мовай.

P.S. Калі калонка была падрыхтавана да публікацыі, стала вядома, што А.Бяляцкі быў паўторна выкліканы ў Следчы камітэт і дапытаны – па-беларуску. Што цікава – той жа следчай **М.Кананавай**. Усяго за два дні (!), якія мінулі пасля першай сустрэчы з Бяляцкім, яна «вывучыла» мову. Што ж, выпадак паказальны і павучальны для ўсіх. І дзякуй скажам, калі беларуская мова назаўжды прыжывецца ў сценах Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Под катком санкций

Госдепартамент США объявил, что с 27 апреля, возможно, возобновятся отмененные ранее санкции против следующих белорусских предприятий: концерна «Белнефтехим», «Белшины», «Гродно Азота», «Гродонохимволокна», лидской «Лакокраски», «Нафтана», «Полоцк-Стекловолокна», «Белорусского нефтяного торгового дома». Белорусским властям дали время, чтобы они освободили из тюрем всех политзаключенных и прекратили насилие против собственного народа.

Шесть лет назад введенные США санкции отрезали для экспорта белорусских предприятий американский рынок. Тогда, учитывая незначительные объемы продаж, белорусские производители из-за санкционного списка не очень-то и печалились. Но за это время многое изменилось. Теперь в этот список автоматически попадают любые компании и физические лица из любой страны, которые могут иметь коммерческие отношения с попавшими под санкции белорусскими предприятиями. А далее по цепочке под санкции попадают любые партнеры партнеров тех же белорусских предприятий и организаций. Получается, что любой европейский покупатель нефтепродуктов «Нафтана» должен быть готов к тому, что американский рынок для него будет закрыт и соответствующей угрозе будут подвергнуты его партнеры. Любой банк, который вознамерится кредитовать белорусские предприятия из санкционного списка, рискует потерять американских клиентов. Если у «Нафтана» начнутся трудности со сбытом продукции на европейском рынке, возникнет риск недополучения валютной выручки с последующей ускоренной девальвацией белорусского рубля.

Таким образом, санкционный список может расшириться в геометрической прогрессии. Недаром в крупных западных компаниях появились целые структуры, которые контролируют новые и действующие контракты по поводу рисков, возникающих вследствие американских санкций. Когда США вводят санкции, подсанкционные компании становятся изгоями, с ними отказываются сотрудничать практически все партнеры. Достаточно показательна в этом отношении история с приостановкой строительства второй нитки российского газопровода по дну Балтийского моря. Из-за подобных американских санкций из проекта вышли практически все иностранные участники. И прокладка труб замерла. Что касается России, сотрудничество ее предприятий с партнерами, попавшими под санкции США, также становится проблематичным. Американский доллар является главной мировой валютой, и американцы контролируют финансовые потоки по всему миру.

По примеру России белорусские власти решили тоже огрызнуться в ответ на санкции Евросоюза и Минфина США. На днях увидел свет соответствующий указ о контрсанкциях Беларуси против стран, замеченных в недружественных действиях в отношении белорусских властей. Можно предположить, что в первую очередь они направлены против таких стран-соседей, как Польша и Литва. Указ ограничивает импорт из подсанкционных стран определенных товаров и услуг, списки которых правительство опубликует отдельно. Как же быть руководству Беларуси сейчас, когда санкции ввели и ЕС, и США, и отдельно еще по физическим лицам страны Балтии? Распространять свои контрсанкции на всех недоброжелателей?

Примечательно, что США во внешней торговле Беларуси услугами занимают второе место после России. В прошлом году оборот услуг между США и Беларусью составил 1417,7 миллиона долларов. Причем положительное сальдо для Беларуси – думается, не без вклада ПВТ – достигло 1103,1 миллиона долларов.

Экономика Беларуси давно стагнирует. А по мнению многих аналитиков, начиная с августа прошлого года она стремительно деградирует. Антизападные санкции в открытой и малой экономике Беларуси могут лишь усугубить положение. Чиновники Минэкономики РБ бодрятся, утверждая, что в начале 2021 года наметилась положительная динамика, по итогам января–февраля ВВП вырос на целых 0,8%. Но это на фоне низких показателей первых месяцев прошлого года из-за нефтяного конфликта с Россией. Вопрос в том, какой станет динамика ВВП, когда эффект низкой базы уйдет. Нет ответа у властей и на другой, более важный, вопрос: почему принято с грифом «Для служебного пользования» постановление правительства «О социально-экономическом развитии на 2021 год», если аналогичный документ всегда был в открытом доступе? Скорее всего, отраженные в нем показатели учитывают реальное положение дел в экономике и никак не согласуются с пятилетним планом, утвержденным на последнем так называемом Всебелорусском народном собрании.

Некоторые эксперты связывают почти синхронное введение антибелорусских санкций со стороны ЕС и США с усилением давления на белорусские власти извне с целью подтолкнуть их к началу переговоров с оппозицией по выходу из политического и экономического кризиса. Так, ЕС вскоре собирается обнародовать четвертый пакет санкций. В любом случае для экономики Беларуси наступают еще более тяжелые времена.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Александра СЛУЦКАЯ:

«Мама не хандрит»

*Известный белорусский медиаменеджер, основатель белорусского «Пресс-клуба» **Юлия Слуцкая** находится в СИЗО почти четыре месяца. Ее задержали 22 декабря 2020 года в минском аэропорту по возвращении из отпуска, попросив пройти через «красный» таможенный коридор. «Народная Воля» пообщалась с дочерью Юлии Александрой Слуцкой.*

– Александра, напомните, до какой даты продлено расследование по делу вашей мамы?

– До 23 апреля. Потом должны либо снова продлить, либо изменить маме меру пресечения. Но здесь никто ничего предугадать не может.

Никаких следственных действий, насколько мне известно, с ней не проводится. За последние два месяца допрос был один раз.

– Свидания вам давали?

– Нет. Мы писали официальные просьбы, но в ответ получали отказы.

– Адвокат часто вашу маму навещает?

– Да, каждую неделю приходит. Иногда даже два раза в неделю.

– Знаю, что одно время у вас были проблемы с перепиской. Сейчас ситуация наладилась? Вы много ее писем публикуете в соцсетях…

– То, что я публикую, – это не письма, а то, что мама рассказывает адвокату на встречах. Так что это письма-рассказы.

Я ношу маме передачи каждый день. На прошлой неделе на бланке, который заполняю, увидела номер камеры. И поняла, что ее перевели в другую камеру. Меня это очень встревожило, женщина в окошке передач даже начала меня утешать: мол, в этой камере даже лучше, она меньше. Но и действительно оказалось, что меньше – шесть квадратных метров на шесть человек. Там была моя мама, студентка Ксюша Сыромолот, а остальные – асоциальные личности. Одна наркоманка, которая всю ночь кричала и не понимала, что ей говорят. У другой женщины был псориаз, с нее кожа клочьями слетала, у третьей вши, от нее плохо пахло. В камере была черная плесень, а все вытяжки – замазаны. Потому что зимой внезапно выяснилось, что через них сидельцы умудрялись как-то переговариваться, поэтому их решили просто замазать, они не работают.



Правда, мама отметила, что в этой камере было чуть больше света, чем в предыдущей. Она нашла позитив даже в этой мелочи!

Мама неделю провела в этой камере, а потом ее снова вернули в ту, в которой она и была.

– А с чем было связано такое «путешествие»?

– Мама конкретно не знает – никто не объясняет, с чем это связано. Их там всех периодически тасуют. Но, по маминому мнению, ее перевели туда как носителя тюремного опыта, чтобы она навела там порядок. Моя мама и вправду умеет найти нужные слова, ей удалось ограничить курение – там все курят, но стали курить раз в час, мама просила не курить во время еды и после отбоя. Но все равно в камере на шесть метров, даже если все будут курить раз в час, – можете представить, какой там воздух. Мама не курит, но очень много кашляет.

– Может, коронавирус?

– Коронавирус у нее уже был, и в данном случае это меня радует. Кашель у нее не коронавирусный, это, скорее, такая реакция организма на прокуренное маленькое пространство. Мы проконсультировались с пульмонологом, передали ей что нужно.

Недавно я ей передала таблетки от глистов еще – для всей камеры сразу. Она попросила.

– Судя по рассказам Юлии Слуцкой, ее морально-психологическое состояние в полном порядке.

– Максимум, что она себе позволяла, – на часок расклеиться, а потом снова берет себя в руки и делает то, что нужно. В СИЗО у нее не было периода, когда бы она сильно хандрила. Мама бодра, позитивна, пытается во всем найти какие-то плюсы.

– Ясности, когда весь этот ужас закончится и будет суд, пока нет?

– Нет, даже и близко не видно пока ничего такого. До суда, по моим ощущениям, очень далеко.

– Родные сотрудников «Пресс-клуба» перечислили Следственному комитету 110 тысяч рублей за якобы причиненный деятельностью культурно-просветительского проекта ущерб. Возможно, это поможет избежать суда, ведь есть статья 88-1 УК – освобождение от уголовной ответственности в связи с добровольным возмещением причиненного ущерба?

– Мы писали ходатайство о том, чтобы прекратить дело, но получили отказ.

– У вашего брата Петра Слуцкого какие последние новости? Его допрашивают?

– Нет, его допрашивают не чаще, чем маму. За последние два месяца не было ни одного допроса. Он тоже просто сидит.

– И какой смысл держать людей в СИЗО?

– У нас в стране принцип: вначале посадить, а потом уже что-то найти…

Марина КОКТЫШ.

З ЮБІЛЕЕМ!

Аляксандр ЛЯВОНЧЫК:

«Каб я іграў на цымбалах, жонка ўсё жыццё іграла на патэльнях, місках і лыжках»

Каму пашчасціла бываць на канцэртах беларускага цымбаліста Аляксандра ЛЯВОНЧЫКА, той пацвердзіць: яго музыка можа ўсё – і смяяцца, і плакаць, і змусіць проста ў філарманічнай зале пад гукі «Лявонiхі» пайсці ў скокі. Славуты выканаўца-віртуоз, папулярызатар цымбалаў, педагог, заснавальнік музычнай дынастыі гэтымі днямі адзначае сваё 80-годдзе. А напярэдадні запрасіў «Народную Волю» да сябе дамоў – пагаварыць аб пражытым.

– Аляксандр Дзмітрыевіч, прыміце віншаванне з юбілеем! Вы равеснік Вялікай Айчыннай – нарадзіліся ў 1941-м. Атрымліваецца, што вы ўсю вайну ў калысцы правялі?

– Вайна не цырымонілася ні з кім, нават з малалеткамі, якія ў калысках спалі. Мы жылі на Лагойшчыне – у вёсцы Свідна, затым у Косіна. Тата быў у партызанах. У 1943 годзе немцы арыштавалі маму і мяне з братам як партызанскую сям'ю і прывезлі ў Мінск. Мы былі на валасочак ад смерці. На наша шчасце, у сталіцы жыла маміна сястра, яна прадала ўсё, што змагла, і выкупіла нас праз знаёмых паліцаяў. Мне было ўсяго два гадкі… Пра тыя падзеі я ведаю з пазнейшага расказу маці. А што самому помніцца? Голад. Адчуванне голаду. Помню, што ўвесь час хацелася есці.

– А калі вы ўпершыню пабачылі і пачулі цымбалы?

– Пасля вайны бацьку прызначылі старшынёй сельсавета ў вёсцы Янушкавічы, потым у Калачы. І мы пераязджалі за ім з месца на месца. У Калачах я пайшоў у школу. Мама мяне вучыла і дома, і ў школе – яна пачатковыя класы вяла. А ў Калачах жыў цымбаліст Веніямін Бурковіч. Там я і пачуў цымбалы. Але найперш навучыўся іграць на гармоніку – прыкладна ў восем гадоў. У нашай сям'і любілі музыку, песні (дзед іграў на скрыпцы). Часам мы ўсе разам сядалі на прызбу і спявалі беларускія песні. Да гэтай пары помню нашу «фірменную» «Зялёны дубочак», яе тата вельмі любіў (*спявае*): *«Зялёны дубочак, шырокі лісточак. / Куды вецер вее, туды галлё гнецца…»*

– Дык вы сямейным ансамблем і на вяселлях маглі выступаць, трохі зарабляць. Даводзілася?

– Не, для музычнага «бізнесу» малаваты я быў. Іграў, бывала, у школе, у клубе, зразумела ж, бясплатна. Пасля школы вырашыў навучацца музыцы. Павезла мяне з гармонікам мама ў Мінск, у музычнае вучылішча. Прыйшоў дырэктар, паглядзеў на мяне і кажа: «Будзеш іграць на цымбалах». Ну, я 10 дзён пазаймаўся, вывучыў «Перапёлачку», яшчэ нейкую кампазіцыю і – прайшоў на экзаменах.

– Значыць, гармонік пад ложак – і ўзяліся за цымбалы?

– Па першым часе і ложка нармальнага не было, жыў на здымных кватэрах. Але цяга да музыкі заглушала ўсе побытавыя праблемы. І сёння з удзячнасцю згадваю сваю настаўніцу Аляксандру Кананові́ч – першыя поспехі да мяне прыйшлі дзякуючы ёй. Аляксандра Пятроўна працавала ў народным аркестры, а ў Оперным тэатры была філармонія. У вучылішчы класаў бракавала, не было дзе займацца. І яна дамовілася з вахцёрамі ў Оперным, каб нас пускалі туды. Мы там ігралі колькі хацелі, а часам і начавалі. Прыкладна праз год мяне заўважыў Іосіф Жыновіч і запрасіў у свой знакаміты аркестр, які неўзабаве паехаў у Маскву на Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. 1957 год, мне шаснаццаць, і я выступаю ў Маскве! Напэўна, я быў самы малады ўдзельнік таго фестывалю.

– Дык вы яшчэ падлеткам трапілі да Жыновіча? Аднакурснікі не зайздросцілі?

– Так, я тады сумяшчаў стацыянарнае навучанне і аркестр. Магчыма, і зайздросцілі. Дык і я ім таксама зайздросціў! Тым, якія жылі дома, мелі піяніна ды іншыя інструменты. Мне, праўда, бацькі купілі невялікія цымбалікі – просценькія, недарагія. Потым я скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю, працаваў салістам-інструменталістам у філармоніі, выкладаў.

– Скрыпка адразу выклікае асацыяцыі з Італіяй, балалайка – з Расіяй, бандура – з Украінай. А ці можна сказаць, што цымбалы – беларускі нацыянальны інструмент?

– Сказаць можна, але гэта будзе няпраўдай. Таму што музычныя інструменты з нацягнутымі струнамі, па якіх б'юць адмысловымі малаточкамі, існавалі – ад старажытнасці – у многіх краінах. Спецыялісты лічаць, што самая моцная цымбальная школа – венгерская, на другім месцы – кітайская. Беларуская – на трэцім.



Выступленне з сынам Алесем.

– Што ж, і трэцяе месца ганаровае – калі ў сусветным рэйтынгу. І вы ж па свеце нямала паездзілі з выступленнямі. У якіх краінах пабывалі?

– У Германіі, Польшчы, Швецыі, ЗША, Канадзе, Францыі, В'етнаме, Камбоджы, Манголіі, Даніі, Фінляндыі... А першая замежная паездка надарылася ў Германію (ГДР) – у 1962 годзе. Мы, даволі вялікая група беларускіх артыстаў, там цэлы месяц выступалі перад воінамі Савецкай арміі. Помню, апошні канцэрт давалі ў пасольстве Савецкага Саюза ў Берліне. Прысутнічаў і камандуючы групай войск Іван Якубоўскі – беларус, наш зямляк. І калі мы выйшлі на паклон, ён падышоў да нас, расчулена падзякаваў. Ардынарац тут жа паднёс усім чаркі з каньяком, і з кожным маршал чокнуўся. Праз гады два – яшчэ адны замежныя гастролі, зноў для нашых вайскоўцаў, гэтым разам у Польшчы. І потым даводзілася неаднойчы ездзіць па гарнізонах – і тут, і за мяжой. Так што я амаль адслужыў.

– Мог маршал Якубоўскі па-зямляцку і званне вам якое-небудзь даць. А з чаго вырабляюцца цымбалы, з якога дрэва?

– Корпус – з елкі (першая дэка абавязкова яловая). Калкі, на якіх трымаюцца струны, – дубовыя ці з буку. Малаточкі – звычайна з вішні. Раней добрыя цымбалы рабілі на Барысаўскай музычнай фабрыцы. Сёння ўжо не робяць. Нейкая мінская фірма вырабляе.

– А ці даўгавечныя цымбалы? Адных на ўсё жыццё можа хапіць?

– Гледзячы з якой інтэнсіўнасцю на іх іграць. Можа хапіць адныхдвух. У мяне было каля дзясятка, калі лічыць і сынавы.

– Цымбалы і пад паху не возьмеш, і за плечы не закінеш. Як вы іх насілі?

– Насіў, неяк прыстасоўваўся. Прытым яны даволі цяжкія – прыкладна 15 кілаграмаў. Помню, неяк прыехалі ў Віцебск, нас ніхто не сустрэў, дык я ў трамвай са сваім інструментам ледзь пралез. Праўда, потым Міністэрства культуры выдзеліла нам аўтобусік невялічкі, «кубанец», то стала лягчэй.



Аляксандр Лявончык.

– Рэдка які цымбаліст быў узнагароджаны ордэнам. Вы яшчэ за савецкім часам атрымалі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Прыемна было?

– Чаму ж не! Мы атрымалі ордэны разам са светлай памяці Міхасём Дрынеўскім. Калі я быў салістам філармоніі, вельмі часта даводзілася выступаць, мы давалі канцэрты дзе толькі можна – у школах, у санаторыях, у інстытутах, на заводах… Тысячы канцэртаў! Не злічыць і замежных гастроляў, дзе мы прадстаўлялі Беларусь…

– Ці заўсёды глядач разумеў, што на сцэне беларусы? Калі ў 1976 годзе «Песняры» з трыумфам выступілі ў ЗША, у некаторых газетах пісалі пра «савецкі фольк».

– Я іграў пераважна беларускую музыку – «Лявоніху», «Юрачку», «Мікіту» ў апрацоўках Яўгена Глебава, таго ж Жыновіча, мелодыі розныя, скажам, «Мой родны кут». Часта выступленні за мяжой адбываліся ў межах Дзён беларускай культуры.



З жонкай Нінай Міхайлаўнай.

– Вось перада мной – шведская газета, якой амаль паўвека. На першай паласе два вялікія здымкі – зверху каралеўскі картэж едзе, а ўнізе – Лявончык за цымбаламі. Дык вас там па-каралеўску прымалі?

– Так, надзвычай прыхільна. Паўсюль – поўныя залы, воклічы «Біс!». Праўда, мы, як правіла, вялікай групай выязджалі – танцоры, спевакі. Скажам, мне пашчасціла выступаць разам з такімі спевакамі, як народныя артысты Беларусі Віктар Вуячыч, Ігар Сарокін.



Малодшы сын Міхаіл.

– Аднойчы я бачыў, як вы вялі канцэрт. З вас і канферансье выдатны атрымаўся б!

– Я заўсёды вёў нашы канцэрты на беларускай мове. Шмат вершаў беларускіх чытаў. І сёння памятаю: *«Ой, цымбалы, вы, цымбалы, / Струны гучна звонкія! / Шмат вякоў вы паслужылі / Для нашай старонкі. / Вы заўсёды дабаўлялі / Многа весялосці, / Ці вяселле, ці ігрышча – / Вы першыя госці».* У Аркадзя Куляшова цэлая паэма ёсць – «Прыгоды цымбал», і з яе ўрыўкі чытаў.

– Я ўсё жыццё лічыў, што цымбалы – вясёлы мажорны інструмент, пакуль не пачуў, як вы ігралі на развітанні з Нілам Гілевічам. Дарэчы, у яго ёсць прысвечаны вам верш «Беларускія цымбалы».

– На цымбалах можна любую музыку зайграць, і мажорную, і мінорную. Скажам, у маім рэпертуары ёсць і «Авэ, Марыя». Калі памёр Ніл Сымонавіч, я падумаў: як магу ўшанаваць памяць свайго вялікага земляка? Музыкай! Паэт, дарэчы, заўсёды прыходзіў на мае мінскія сольныя канцэрты. Гадзіны дзве я іграў у Свята-Петрапаўлаўскай царкве, дзе праходзіла развітанне. Пасля мне сын Гілевіча, Сяргей Нілавіч, сказаў, што не плакаў, як тата памёр, а як загучалі цымбалы, то заплакаў...

– Гэта сапраўды было надзвычай прачула, асабліва калі загучала мелодыя «А я лягу-прылягу / край гасцінца старога…». Вашы абодва сыны – таксама музыканты. Выходзіць, вы заснавальнік музычнай дынастыі Лявончыкаў?

– Выходзіць, так. Старэйшы, Алесь, спачатку хацеў стаць шафёрам. Бо ў вёсцы ён бачыў, што дзеду часам трэба прывезці сена ці дровы, а няма на чым. То ён хацеў дзеду дапамагаць па гаспадарцы. Маючы абсалютны музычны слых. Але пайшоў у войска і там зразумеў, што музыка – гэта яго. Дэмабілізаваўся, стаў сур'ёзна займацца. А тут якраз мне прыйшло персанальнае запрашэнне ў Канаду. І Алесь паехаў са мною як акампаніятар. Ён піяніст, але калі не было піяніна, іграў на акардэоне, які засвоіў літаральна за месяц!

– Не дзіва, што такога віртуоза прыкмецілі замежныя менеджары.

– Так, Алесь цяпер жыве і працуе ў Германіі. Але ён там спачатку вучыўся, потым атрымаў працу. У малодшага сына Міхася таксама абсалютны слых. Яму яшчэ і адзінаццаці не было, калі на рэспубліканскім конкурсе імя Жыновіча ён заняў першае месца – як цымбаліст. Нават з'ездзіў з канцэртам у Японію. Цяпер разам з братам у Мюнхене жыве.

– Сыны пажаніліся на немках?

– Не. Мае нявесткі – беларускі. Чацвёра ўнукаў маю.

– З дзедам яны на якой мове гавораць?

– Па-беларуску стараюцца.

– Ведаю, што вы з жонкай Нінай Міхайлаўнай пражылі разам 52 гады. Паездкі, гастролі, адсутнасць дома тыднямі… Што мацавала ваш шлюб?

– Каханне, відаць (*усміхаецца*). А яшчэ цярпенне жончына. Ёй было вельмі цяжка, гастролі ў мяне здараліся і па дваццаць дзён. Я ўвогуле лічу, што сям'я трымаецца на жанчыне. Не помню, чые гэта радкі: *«На чым бы тыя геніі ігралі, каб не было наладчыкаў раяляў…»* Я сябе да геніяў не залічваю, але, каб я іграў на цымбалах, жонка ўсё жыццё іграла на патэльнях, місках і лыжках. І толькі часам дапытвалася, хто акампаніятарам са мной едзе – мужчына ці жанчына…

– А залатое вяселле як адзначылі?

– Нам сыны падарылі падарожжа ў Італію. Пяць дзён мы правялі ў зацішным гарадку на беразе Міжземнага мора. Там так ціха, спакойна, адносіны між людзьмі добразычлівыя. Часам мы з жонкай успамінаем тую паездку і марым, каб і ў нашай роднай краіне як мага хутчэй настаў спакой, каб хутчэй скончылася гэтая калатнеча. Каб мы нарэшце ўсе – і народ, і ўлада – «дайшлі да Беларусі», як пісаў-жадаў Ніл Гілевіч.

Міхась СКОБЛА.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Як Мархеля прынеслі ў ахвяру

Пасля правальнага матча нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе з камандай Бельгіі паляцелі галовы. Дакладней – галава галоўнага трэнера.

Нагадаем, што ў адборачным матчы да чэмпіянату свету каманда Бельгіі літаральна зганьбіла беларусаў у вачах футбольнай грамадскасці, атрымаўшы перамогу з хакейным лікам 8:0.

Пасля гэтага, натуральна, ва ўсіх узнікла лагічнае пытанне: а хто давёў беларускі футбол да такога стану, што коцімся ў прорву з касмічнай хуткасцю? І хто за гэта адкажа?

Было лагічна, што пасля такога правалу павінен пакінуць сваю пасаду галоўны трэнер зборнай **Міхаіл Мархель**, пры якім нацыянальная каманда не ўвайшла, а ўляпалася ў гісторыю. Не толькі ў матчы з бельгійцамі. Каманда абсалютна нічога не паказала і ў гульні са зборнай Грузіі, калі была рэальная магчымасць патрапіць на чэмпіянат Еўропы праз Лігу нацый. Зрэшты, можа, гэта і да лепшага, бо, як паказвае практыка, на еўрапейскім першынстве беларускім футбалістам пакуль рабіць няма чаго.

Калі ж вяртацца да разбору палётаў і раздачы сланоў па выніках бельгійскага фіяска, то крайнімі спартыўныя функцыянеры зрабілі толькі Міхаіла Мархеля і футбалістаў.

У сваім звароце да балельшчыкаў федэрацыя пасыпала галаву попелам: *"Гэтымі днямі на наш адрас прыходзіць шмат лістоў, звязаных з апошнімі вынікамі нацыянальнай зборнай. У прыватнасці, заўзятары просяць звольніць галоўнага трэнера каманды Міхаіла Мархеля.*

Прызнаемся, поўнае паражэнне ў Бельгіі балюча ўдарыла і па работніках асацыяцыі – ад кіраўніцтва да шараговых супрацоўнікаў. Відавочна: менавіта па выніках зборнай больш за ўсё шасць людзей і робіць высновы пра развіццё віда спорту ў краіне. І такія гульні, як з Бельгіяй, дрэнна адбіваюцца на іміджы беларускага футбола.

...Так, зборная Бельгіі мацнейшая за нашу, але так прайграваць нельга. І вінаватыя тут не толькі трэнер. Падзяліць адказнасць з Міхаілам Мархелем павінны і футбалісты. Пры гэтым цяпер важней аб'ядноўваць, а не шукаць вінаватых. Цяпер той матч – ужо гісторыя".

Адным словам, вінаватыя футбалісты і трэнер, і гэта "балюча ўдарыла" па кіраўніцтве федэрацыі на чале з былым ваенным камісарам і экс-дэпутатам Палаты прадстаўнікоў **Уладзімірам Базанавым**. "Работнікі асацыяцыі", як аказалася, у гэтай сітуацыі – пацярпелы бок, але, як джэнтльмены ў белых пальчатках, не супраць перагарнуць старонку.

Ды Базанаў пасля такога правалу першы павінен быў пакласці на стол заяву аб звальненні! Прынялі б адстаўку альбо не – іншая справа, але ўчынак быў бы па-мужчынску годны. Не дачакаліся.

Зараз Беларуская федэрацыя футбола прызначыла выконваючым абавязкі галоўнага трэнера зборнай **Георгія Кандрацьева**, які раней займаў пасаду асістэнта галоўнага трэнера.

Гэта ўжо другое прышэсце Георгія Пятровіча на пасаду настаўніка нацыянальнай каманды. Кандрацьеў кіраваў зборнай з 2012-га па 2014 год і добра ведае, чым усё заканчваецца.

"Я гатовы да таго, што ў выпадку няўдачы зборнай на мяне могуць выліць вядро бруду, – шчыра прызнаваўся трэнер дзесяць гадоў таму. – *Але трэба зрабіць усё, каб гэтага не дапусціць".*

Тады на галаву спецыяліста вылілі не адно вядро, але сёння Георгій Пятровіч ізноў на першых рубяжах. І яму можна толькі паспачуваць. Бо крайнім ў любым выпадку чыноўнікі зробяць менавіта яго.

Алесь СІВЫ.

НУ І НУ!

Час збіраць камяні…

Журналіст Мікалай Іваноў у сваім тэлеграм-канале паведаміў аб незвычайным спосабе матывацыі ігракоў у брэсцкім футбольным клубе «Рух», якім валодае бізнесмен Аляксандр Зайцаў.

Пасля трох нічыйных вынікаў запар у чэмпіянаце краіны каманда ў свой выхадны дзень адпраўлялася ў адну з сельскіх гаспадарак Пінскага раёна, дзе футбалісты збіралі на полі камяні. Працоўная тэрапія, магчыма, дапамагла – у чацвёртым туры «Рух», як вядома, атрымаў перамогу.

Як жартуюць балельшчыкі на форумах: «Пасля нічых – камяні збіраць. А куды каманду павязуць, калі прайграе?»

Віктар ШПАК.

ФУТБОЛ

Першая перамога дэбютанта

Прайшоў 4-ы тур чэмпіянату Беларусі па футболе.



Па вялікім рахунку тур прайшоў без асаблівых нечаканасцяў, хаця варта адзначыць упэўнены старт салігорскага «Шахцёра» (чатыры перамогі ў чатырох матчах) і першую вікторыю рэчыцкага «Спадарожніка», які ў гэтым сезоне дэбютаваў у вышэйшай лізе.

Вось вынікі тура:

«Энергетык-БДУ» (Мінск) – «Спадарожнік» (Рэчыца) – 0:1, «Іслач» (Мінскі раён) – «Рух» (Брэст) – 0:1, «Слуцк» – «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) – 2:0, «Дынама» (Брэст) – «Дынама» (Мінск) – 1:1, «Мінск» – БАТЭ (Барысаў) – 2:2, «Гомель» – «Нёман» (Гродна) – 2:0, «Славія» – «Віцебск» – 0:2, «Шахцёр» (Салігорск) – «Смаргонь» – 3:0.

Турнірная табліца

Каманды	Гульні	Выйгрышы	Нічыі	Паражэнні	Мячы	Ачкі
Шахцёр	4	4	0	0	10–1	12
Дынама (Бр)	4	2	2	0	6–1	8
Дынама (Мн)	4	2	2	0	5–1	8
БАТЭ	4	2	2	0	8–4	8
Гомель	4	2	1	1	7–4	7
Тарпеда-БелАЗ	4	2	0	2	2–5	6
Рух	4	1	3	0	4–3	6
Іслач	4	2	0	2	3–5	6
Віцебск	4	1	2	1	2–1	5
Мінск	4	1	2	1	5–5	5
Энергетык-БДУ	4	1	1	2	4–3	4
Слуцк	4	1	1	2	3–5	4
Спадарожнік	4	1	0	3	1–7	3
Нёман	4	0	2	2	1–4	2
Славія	4	0	1	3	1–5	1
Смаргонь	4	0	1	3	1–9	1

Фота: fcminsk.by

СВЕТ ДУШИ

Благотворительные хлеба

***Любовь Любчук** – домашний пекарь. Она готовит хлеб для онкобольных детей, бездомных, пенсионеров и многодетных семей. Изначально девушка открывала обычный бизнес, но вскоре он стал благотворительным. Почему? Вот ее интервью «**Народной Воле**».*



– Пока вы готовите тесто, можно я сделаю пару кадров?

– Пожалуйста. Главное мне не сбиться в пропорциях, а то могу с вами заговориться и что-нибудь забыть положить…

– Предполагаю, что рука у вас набита. Кстати, а сколько буханок готовите на сегодня?

– По моему условному расписанию – двадцать одну. Чтобы успеть столько испечь, встаю в четыре утра, а заканчиваю около девяти вечера. Это если с доставкой.

– Сколько готовится самый «долгий» хлеб?

– Двадцать четыре часа! Самый «короткий» – десять. Само тесто очень реагирует на погодные условия, давление, температуру воздуха. Почти каждый раз получается «разный» хлеб.

Первое, что я делаю утром, – это включаю печки. У меня их две: конвекционная и обычный духовой шкаф. Сразу после этого я ставлю опару и «кормлю» закваску. Только на это уходит больше часа...

– Я так понимаю, что если куда-то нужно уехать, то закваску не бросите?

– Именно! Больше, чем на двое суток, оставить не могу, надо же «кормить». Если кому-то объясняю, почему не могу уехать, то всегда звучит смешно.

– Для кого печете?

– Помогаю многодетным семьям, малоимущим, бездомным, пенсионерам и детям из онкологического центра. Сначала задумывала свое дело как бизнес, но вскоре поняла: бизнесвумен из меня не получится. Чувствовала неудовлетворение от того, чем занимаюсь, хотя хлебопечение определенно мое занятие. Не получалось с реализацией, нужно было наладить логистику, оформлять много документов, вести бухгалтерию, а мне не хотелось этим всем заниматься. Только печь! Вообще считаю, что существует «хороший» и «плохой» бизнес. «Плохой» – это потребительский, то есть когда человек только берет, то есть считает прибыль, но при этом что-то отдавать не хочет. А мне хотелось именно отдавать. Причем как можно больше. Для того чтобы установить равновесие между «плохим» и «хорошим», ушла на благотворительные хлеба!

– Любовь, а как постигали науку выпекания хлеба?

– Самостоятельно. Некоторые виды хлеба приходилось осваивать по многу раз. Не получалось. Багет до сих пор не умею хорошо печь, поэтому за него и не берусь. Делаю только то, что умею на отлично: тартин, городскую булку, финский, чиабатту, дарницкий…

– Наверное, уже знаете, кто из ваших подопечных какой хлеб любит…

– Конечно, знаю. Дети в онкологическом центре, например, больше любят пшеничный. Дрожжевой им нельзя. Еще любят чиабатту, тартин и хлеб с семечками.

– Вы с ними встречались? Или только передавали?

– Пока не встречалась. Но хочу обязательно увидеться. Пока мне только присылают фотографии детей с хлебом. Когда вижу, становится очень тепло на душе.

– Объемы выпечки у вас приличные, а затраты?

– Спонсором моего дела стал муж. Он работает программистом, зарабатывает хорошо. Поэтому мы решили: можем позволить определенную сумму из семейного бюджета выделять на такую помощь нуждающимся. Больше всего денег трачу на стикеры, которые клею на упаковку с хлебом. Все же хочется, чтобы выпечка не только радовала на вкус, но и упакована была достойно.

– Вижу, что мука у вас не белорусская…

– Белорусская мука слабая: тесто из нее не способно хорошо растягиваться, рвется. Поэтому заказываю российскую.

– Домашние не жалуются, что дома работаете?

– Сын в школе целый день, муж тоже дома работает. Вот мне скоро будут нужны еще несколько печей… Видимо, тогда придется расширяться точно не на домашней кухне!

– О других спонсорах задумывались?

– Да, буду рада, если кто-то захочет помочь на безвозмездной основе. Особенно с доставкой! Сейчас иногда помогают волонтеры, но все же основная часть на мне. Хорошо, что уже весна. Планирую делать доставку на велосипеде…

– Французские мотивы?

– Дешево, сердито и по-французски одновременно! Хотя багеты, повторяю, определенно не мое!

Фира РАЗУМОВСКАЯ.

УСМІХНІЦЕСЯ...

* * *

– Чаму хочаце развесціся з мужам?
– У нас розныя рэлігійныя погляды.
– А больш канкрэтна…
– Ён не прызнае мяне багіняй.

* * *

– Мне зарплату пропісам пісаць?
– А якая яна ў вас?
– 450 рублёў.
– Тады пішыце слязьмі.

* * *

У суседа – перфаратар, затое ў мяне – піяніна. Рамонты калі-небудзь ды канчаюцца, музыка – вечная.

* * *

Я не тоўсты, проста грошы на яду маю.

* * *

Мужчыны, помніце: ваша жанчына павінна падабацца толькі вам. А не вашым бацькам, сябрам і тым больш вашай жонцы.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 326-68-71
Рэкламны аддзел (017) 363-66-04
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ
Пакольк ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).